НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# МАТЭРЫЯЛЫ
## МІЖНАРОДНАГА КАНГРЭСА

## *«500 гадоў беларускага кнігадрукавання»*

**Частка 1**

*XIII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні*

Мінск, 14–15 верасня 2017 г.



**Мінск 2017**

17. **Szul, R.** Język. Naród. Państwo. Język jako zjawisko polityczne / Roman Szul. – Warszawa : Wydawnictwo Naukowe PWN, 2009. – 416 c.
18. **W. Ł.** 1491–1916 / W. Ł. // Homan. – 1916. – № 1. – 15 lutaho.
19. **W. Ł-ski.** U 400-letniuju hadauščynu / W. Ł-ski // Homan. – 1917. – № 7 (99). – 23 studnia.
20. **Włast.** Karotkaja historyja Biełarusi / Włast // Naša Niwa. – 1910. – № 8. – 18 (3) Lutaho (Fiewrala).

***Вабішчэвіч А.М.*** *(Брэст)*

# УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

*В Западной Белоруссии в 1921–1939 гг. усилиями национальной интеллигенции, студентов и учащейся молодежи проводилось изучение и популяризация наследия Ф. Скорины. Празднование в БССР в конце 1925 г. 400-летия белорусской печати было активизировано торжествами в Вильно 25 марта 1925 г. В отличие от БССР, в 1936 г. в Западной Белоруссии отмечалось 450-летие со дня рождения Ф. Скорины. Имя белорусского первопечатника носила белорусская гимназия в Радошковичах, Белорусская типография в Вильно и другие западнобелорусские общественные учреждения и организации. Однако фундаментальные исследования в области скориноведения были возможны только в условиях объединенной белорусской нации.*

400-годдзе выдання ў Празе Біблії Францыска Скарыны не было адзначана ў 1917 г. урачыстымі мерапрыемствамі на беларускіх землях. На гэта паўплывала Першая сусветная вайна (заходняя частка Беларусі была акупавана кайзераўскімі войскамі, а ва ўсходняй, прыфрантавой, была выключана грамадская дзейнасць), падзеі Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый у Расіі. Ушанаванне Ф. Скарыны ў 1917 г. было абмежавана толькі асобнымі публікацыямі ў беларускім друку.

Цікавасць да асобы Ф. Скарыны актывізавалася ў сярэдзіне 1920-х гг. у розных частках Беларусі, падзеленай Рыжскім мірным дагаворам 1921 г., а таксама ў асяроддзі беларускай палітычнай эміграцыі. На старонках часопіса «Крывіч» (Каўнас) 400-годдзю беларускага друку быў прысвечаны ў 1924 г. артыкул В. Ластоўскага, у якім былі выкладзены біяграфічныя звесткі пра першадрукара, адзначаны адметнасці яго выданняў. Ф. Скарына названы «найвялікшай постаццю» беларускай гісторыі, прызнаецца «культурнейшым чалавекам» свайго часу [8]. В. Ластоўскі прапанаваў для юбілею ўзяць за адлік 1525 г., калі ў Вільні была выдадзена кніга Ф. Скарыны Апостал (тады прытрымліваліся менавіта такога датавання гэтага выдання).

У Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы, асноўны цяжар навукова-асветніцкай працы быў ускладзены на нацыянальныя грамадскія структуры ў Вільні. Найперш выдзялялася Беларускае навуковае таварыства (БНТ), пры якім яшчэ ў 1921 г. быў адкрыты Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. Луцкевіча. У бібліятэцы музея сярод старадрукаў мелiся асабліва каштоўныя экспанаты, у тым ліку частка пражскага выдання Бібліі Ф. Скарыны 1517 г.

Святкаванне 400-годдзя беларускага друку было прымеркавана нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычнай грамадскасцю Заходняй Беларусі ў 1925 г. да чарговай гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. Як адзначалася ў газеце «Крыніца», «слушна і лагічна два беларускія ідэалы лучацца ў адзін і што да часу і што да зместу, бо яны сапраўды становяць адзін суцэльны народны беларускі ідэал, каторы ёсць мэтай, да якой беларускі народ імкнуцца павінен, а такжа разам і маральнай сілай у змаганні за гэты ж ідэал гэтага ж народа» [3]. К. Сваяк напісаў асобны верш «Памяці Францішка Скарыны слаўнага доктара з Полацка» [20]. Усе ўрачыстасці праходзілі ў Вільні. Зранку 25 сакавіка 1925 г. адбылася імша ў літоўскім касцёле св. Мікалая, якую праводзіў ксёндз А. Станкевіч. Прыгожымі спевамі вызначыўся касцёльны хор пад кіраўніцтвам А. Стаповіча. Пасля імшы з прамовай выступіў ксёндз В. Гадлеўскі. Вечарам у запоўненай людзьмі залі Віленскай беларускай гімназіі адбылася ўрачыстая «акадэмія» памяці Ф. Скарыны. Сярод выступоўцаў былі А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, адвакат Т. Урублеўскі, ад украінцаў – пасол (дэпутат) у польскім сейме С. Казіцкі, ад літоўцаў – грамадскі дзеяч Д. Альсейка і ксёндз К. Чыбірас, пасол М.Л. Хельман, прадстаўнікі ад мясцовых яўрэяў, друкароў і інш. [11].

У падрыхтаванай да юбілею брашуры «Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі (1525–1925)» [12] (друкавалася на старонках газеты «Крыніца» [21]) А. Станкевіч даваў высокую ацэнку гуманістычнай, дэмакратычнай дзейнасці беларускага першадрукара. Прадстаўлена жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны як славутага дзеяча асветы і культуры эпохі Адраджэння, яго заслугі як перакладчыка, вучонага, пісьменніка, выдаўца.

У БССР адразу адрэагавалі на юбілейныя ўрачыстасці ў заходнебеларускім краі. Прэзідыум Інбелкульта паведамляў, што 25 сакавіка 1925 г. у Заходняй Беларусі ўрачыста святкуецца 400-годдзе айчыннага кнігадрукавання. «Гэтае вялікае свята беларускай культуры нам прышлося адлажыць на восень, каб уся Савецкая Беларусь магла належна да яго падрыхтавацца. Сягоння ж мы пасылаем нашы прывітанні працоўным Заходняй Беларусі. З падзівам і радасцю мы сочым за іхняй абаронай культурных багаццяў, пакінутых беларускаму народу ў спадчыну Скарынай…» [9]. На наш погляд, праведзеныя ў Заходняй Беларусі ўрачыстасці, актывізавалі арганізацыйную працу ў БССР па святкаванні 400-годдзя беларускага друку, якая была праведзена ў канцы 1925 г. на высокім дзяржаўным узроўні [14].

Імя першадрукара было ўшанавана ў назве шэрага заходнебеларускіх грамадскіх установ, аб'яднанняў. Так, у 1922 г. была адкрыта рэгіянальнай арганізацыяй Таварыства беларускай школы (ТБШ), заснаванай сенатарам А. Уласавым, беларуская 8-класная гімназія гуманітарнага тыпу імя Ф. Скарыны ў Радашковічах Маладзечанскага павета. За ўвесь перыяд яе існавання (закрыта польскімі ўладамі ў 1929 г.) там вучыліся больш за 860 чалавек, з іх 86 атрымалі «матуру» (атэстат) [2]. Выкладчыцкай працай у Радашковіцкай беларускай гімназіі імя Ф. Скарыны займаўся Я. Драздовіч. Там была ў 1927 г. наладжана выстаўка яго палотнаў, а таксама прац вучняў. Менавіта партрэтам беларускага першадрукара, напісаным спецыяльна для Радашковіцкай беларускай гімназіі імя Ф. Скарыны і прадстаўленым на гэтай выставе, пачыналася яго серыя карцін скарыніяны.

Пры дапамозе польскіх улад было інспіравана з'яўленне ў Вільні ў чэрвені 1931 г. пры Віленскім універсітэце імя С. Баторыя альтэрнатыўнага Беларускаму студэнцкаму саюзу нешматлікага Беларускага студэнцкага таварыства імя Ф. Скарыны (карпарацыі «Скарынія»), падкантрольнага паланафільскаму Цэнтрасаюзу. Па прапанове БНТ студэнцкае аб'яднанне «Скарынія» наладзіла ў 1932 г. цыкл навукова-папулярных лекцый. Аднак дзейнасць нешматлікіх і неўплывовых паланафільскіх арганізацый не карысталася шырокай падтрымкай заходнебеларускай грамадскасці, таму «Скарынія» перастала існаваць у 1934 г.

У 1926 г. А. Станкевіч заснаваў у Вільні Беларускую друкарню імя Ф. Скарыны, дзейнасць якой працягвалася да вясны 1941 г. У Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны выконваліся замовы на друкаванне ад розных беларускіх, польскіх і рускіх арганізацый. Там было надрукавана больш за 160 беларускіх арыгінальных і перакладных выданняў рэлігійнай і свецкай тэматыкі, сярод іх творы Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, В. Адважнага, А. Станкевіча і іншых аўтараў, зборы фальклору, песеннікі, календары, інструкцыі і інш. Друкаваліся газеты «Беларуская крыніца» («Крыніца»), «Сялянская ніва», «Зорка», часопісы «Калоссе», «Хрысціянская думка», «Шлях моладзі», «Самапомач», «Праваслаўны беларус», дзіцячы часопіс «Пралескі», кніжныя выданні Беларускага выдавецкага таварыства, Беларускага каталіцкага выдавецтва, БНТ, ТБШ, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК), выданні Беларускай сялянска-работніцкай грамады і інш. [17]. Прадукцыя друкавалася лацінскім (пераважна) і кірылічным шрыфтамі. У 1937 г. друкарня ўвайшла ў склад створанага агульнабеларускага выдавецтва «Белпрэс».

У міжваеннай Польшчы вывучалі жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны [1]. Безумоўна, прадстаўнікамі заходнебеларускай інтэлігенцыі рабіліся пэўныя захады ў галіне скарыназнаўства, аднак у Заходняй Беларусі не было ўмоў для фундаментальных гістарычных даследаванняў. БНТ у Вільні займалася пераважна навукова-асветніцкай, збіральніцкай працай. Заходнебеларускія дзеячы пільна сачылі за сур'ёзнымі дасягненнямі ў гэтым напрамку ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. Так, у часопісе «Родныя гоні», што выдаваўся

ў Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, была змешчана публікацыя І. Дварчаніна «Аб годзе нараджэння Ф. Скарыны» [4]. Звернута ўвага на 2 артыкулы, якія выйшлі ў 1925 г. у часопісе «Полымя» ў Мінску – М. Шчакаціхіна «Калі нарадзіўся Скарына» [18] і А. Харэвіча «Ф. Скарына і яго эпоха» [16]. І. Дварчанін лічыў больш праўдападобнай, хоць і не даказанай, пазіцыю А. Харэвіча, што ўслед за П. Уладзіміравым, аўтарам фундаментальнай манаграфіі пра Ф. Скарыну, сцвяржаў аб нараджэнні беларускага першадрукара ў 1490 г. Разам з тым І. Дварчанін пагадзіўся з арыгінальнай гіпотэзай М. Шчакаціхіна аб нараджэнні Ф. Скарыны 6 сакавіка 1486 г., калі адбылося сонечнае зацменне. Сам І. Дварчанін у 1926 г. абараніў у Празе дысертацыю, прысвечаную аналізу дзейнасці і светапогляду Ф. Скарыны [5].

Наступны юбілей – 450-годдзе з дня нараджэння Ф. Скарыны – адзначаўся ў Заходняй Беларусі ў 1936 г. Такія ўрачыстасці былі немагчымы тады ў Савецкай Беларусі, дзе з канца 1920-х гг. разгортвалася барацьба з «нацыянал-дэмакратызмам». 1 сакавіка 1936 г. у перапоўненай залі БІГІК у Вільні адбылася публічная лекцыя А. Станкевіча «Францішк Скарына і яго праца». «Вялікі наш і слаўны доктар з Полацка Францішк Скарына – гэта сапраўды прадвеснік адраджэння беларускага народу», – такая ацэнка выкладзена ў перадавіцы газеты «Беларуская крыніца» [6]. Пазней на старонках часопіса «Калоссе» быў апублікаваны артыкул А. Станкевіча «Доктар Францішк Скарына і яго культурная праца» [13].

БНТ таксама ажыццяўляла сваю ўрачыстасць – 8 сакавіка 1936 г. была праведзена ўрачыстая «акадэмія». Былі прачытаны два рэфераты – А. Луцкевіча аб асноўных падзеях у біяграфіі Ф. Скарыны (на падставе тагачасных навейшых даследаванняў) і Я. Станкевіча аб мове перакладаў беларускага асветніка [7]. Падтрымліваючы гіпотэзу М. Шчакаціхіна аб магчымым нараджэнні Ф. Скарыны 6 сакавіка 1486 г., А. Луцкевіч не толькі прааналізаваў усе вядомыя на той час факты з жыцця першадрукара, але і пазнаёміў з неапублікаванымі тады дакументальнымі матэрыяламі эмігранцкага даследчыка А. Флароўскага аб тым, што Ф. Скарына пасля 1532 г. выехаў у Прагу і працаваў там у канцы жыцця каралеўскім садоўнікам. Сам А. Луцкевіч у манаграме з літар у скарынаўскіх кнігах знаходзіў і літару «Г» Я. Станкевіч пасля аналізу мовы перакладаў Ф. Скарыны сцвярджаў, што прадмовы да кніг Бібліі былі на беларускай мове, а «пераклады – гэта няпоўнае збеларушчванне старабалгарскай (г. зв. царкоўнаславянскай) мовы» [7, с. 66]. БНТ была прынята пастанова аб звароце да мясцовага самакіравання Вільні аб наданні імя Ф. Скарыны адной з вуліц горада, але яна так і не была задаволена. 12 лістапада 1937 г. кіраўніцтва БНТ перадало прэзідэнту Вільні дакладную запіску аб наданні 12 вуліцам імён заслужаных беларусаў, сярод якіх быў і Ф. Скарына [7]. Аднак адпаведнае рашэнне ізноў не было прынята.

Некалькі гістарыяграфічных артыкулаў і рэцэнзій У. Талочкі былі прысвечаны адлюстраванню асобных бакоў жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны ў некаторых працах. У часопісе «Калоссе» была змешчана рэцэнзія У. Талочкі

на 2-томнае польскамоўнае выданне «Польскія бернардзінцы» (Львоў, 1933) К. Кантака [15]. Улічваючы тое, што бернардзінцы з'явіліся ў Полацку ў 1498 г. і разгарнулі там сваю дзейнасць, то У. Талочка дапускаў, што «Скарына, відаць, прыняў каталіцтва і новае імя Францішак, культ якога ў каталікоў быў у Еўропе дужа вялікі» [15]. У часопісе «Калоссе» з'явілася яшчэ адна рэцэнзія У. Талочкі пра выдадзеныя ў Празе нямецкамоўныя ўспаміны прэлата З. Галькі-Ледухоўскага [19]. Там ён знайшоў звесткі пра род Скарынаў, «які здаўна жыў у Рэчыцкім павеце Міншчыны і які, напэўна, быў адной з галін не так далёкіх Скарынаў полацкіх» [10]. Пасля азнаямлення з генеалагічнымі і геральдычнымі матэрыяламі У. Талочка зрабіў арыгінальную выснову аб варажскім паходжанні родаў Галька-Ледухоўскіх і Скарынаў [10, с. 242].

У цэлым у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. намаганнямі нешматлікай нацыянальнай інтэлігенцыі, студэнцкай і вучнёўскай моладзі рабіліся захады па вывучэнні і папулярызацыі спадчыны Ф. Скарыны. Аднак яе паўнацэннае даследаванне стала магчымым толькі ў аб'яднанай Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны.

ЛІТАРАТУРА


1. **Батвіннік, М. Б.** Вывучэнне жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны ў Рэчы Паспалітай ІІ у 20–30 гг. ХХ ст. / М. Б. Батвіннік // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Рэчы Паспалітай» (Мінск, 15–16 верасня 2000 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск, 2002. – С. 93–101.

2. **Вабішчэвіч, А. М.** Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст, 2008. – С. 49.

3. **Двайное** свята беларускага народу (25.ІІІ.1925) // Kryniсa. – 1925. – № 12 (25 сак.). – С. 2.

4. **Дварчанін, І.** Аб годзе нараджэння Ф. Скарыны / І. Дварчанін. – Родныя гоні. – 1927. – № 1. – С. 20–22.

5. **Дварчанін, І.** Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве / І. Дварчанін. – Мінск, 1991. – 185, [7] с.

6. **Доктар** Фр. Скарына – прадвеснік беларускага адраджэння // Bieiaruskaja krynica. – 1936. – № 11 (8 сак.). – С. 1–2.

7. Запісы Беларускага Навуковага Таварыства. Сшытак 1. – Вільня, 1938. – С. 65–66.

8. **Ластоўскі, В.** Доктар Францішак Скарына (1525–1925) / В. Ластоўскі // Крывіч. – 1924. – № 2 (8). – С. 3–13.

9. **Савецкая** Беларусь. – 1925. – 25 сак.

10. **Саладух, А.** (Талочка У.). З доследаў аб паходжанні і аб гербе Скарынаў / А. Саладух // Калоссе. – 1936. – № 4 (8). – С. 240.

11. **Святкаванне** Скарынаўскага юбілею // Kryniсa. – 1925. – № 13 (30 сак.). – С. 5.

12. **Станкевіч, А.** Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі (1525–1925) / А. Станкевіч. – Вільня, 1925. – 60 с.

13. **Станкевіч, А.** «Доктар Францішак Скарына і яго культурная праца» / А. Станкевіч. – Калоссе. – 1936. – Кн. 2. – С. 99–100.

14. **Суша, А.** Скарынаўскія юбілеі: ад першага да апошняга / А. Суша // І вечным застанецца слова… : да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання : інфарм.-метад.

выданне. – Віцебск, 2017. – С. 5 ; **Садоўскі, У.** Францыск Скарына – пралетарскі першадрукар. Як у БССР святкавалі 400-годдзе беларускага друку / У. Садоўскі. – Рэжым доступу: https://news.tut.by/society/522602.html. – Дата доступу: 10.01.2017.

15. **Талочка, У.** Да справы веравызнання Ф. Скарыны (З нагоды працы кс. др. К. Кантака «Bernardyni Polscy» Lwyw, 1933) / У. Талочка // Калоссе. – 1935. – № 3. – С. 169–170.

16. **Харэвіч, А.** Францыск Скарына і яго эпоха / А. Харэвіч. – Полымя. – 1925. – № 7. – С. 138–152.

17. **Цыпрыяновіч, С.** Беларуская друкарня імя Францішка Скарыны ў Вільні (1926–1940) / С. Цыпрыяновіч. – Лёндан, 1991 ; Туронак, Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня, 2006. – С. 278–322.

18. **Шчакаціхін, М.** Калі нарадзіўся Скарына / М. Шчакаціхін. – Полымя. – 1925. – № 5. – С. 148–151.

19. **Halka-Ledychowski, S.** Das Buch von meiner Lebensfahrt. Gewidmet dem Andenken seiner Eltern und Vorfahren / S. Halka-Ledychowski. – Prag, 1934–1935. – 412 s.

22. **Krynica.** – 1925. – № 12 (25 сак.). – С. 1.

21. **Krynica.** – 1925. – № 12 (25 сак.); № 13 (30 сак.).

***Башаркина Е.А.*** *(Могилев)*

# ПРОСВЕТИТЕЛЬСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ: АКТУАЛЬНОСТЬ ВНЕВРЕМЕННЫХ ИДЕЙ

*Франциск Скорина был одним из самых образованных людей Беларуси своего времени – первой половины XVI в. Свои знания и опыт, а также большую любовь к своему народу он направил на его просвещение. Ф. Скорина стремился, чтобы дети и взрослые учились на родном языке, чтобы мудрость и наука были высшими добродетелями – решению этих важнейших целей национального образования он посвятил свой труд ученого, писателя, книгопечатника. Плодотворная просветительская деятельность Ф. Скорины стала лучшим образцом почитания науки, утверждения жизнеопределяющего значения обучения и воспитания.*

Имя Франциска Скорины в научной и художественной литературе сопровождается многочисленными определениями-характеристиками, отражающими суть его жизненных позиций и результатов профессиональной деятельности. Ф. Скорина – ученый, писатель, гуманист, просветитель, основатель восточнославянского книгопечатания, деятель белорусской, славянской и мировой культуры. Ряд приведенных определений можно объективно расширять, опираясь на его литературно-педагогическое наследие, свидетельствующее о силе его мысли, слова и дела.

Начиная с биографических данных, исследователями отмечаются сведения, предопределяющие особую культурно-историческую миссию Ф. Ско-